# Інтэрнэт-праект
## «Беларускі архіў вуснай гісторыі» як крыніца інфармацыі для нефармальнай адукацыі

Ірына Кашталян

*«М.В.: Тады ўжо нашыя беларусы пяклі хлеб і насілі ад вёскі да вёскі ў тую сторану, на запад, каб вярнуць яго, адправіць дадому немца...*
*І.: А хто гэты хлеб пёк? Як гэта было?*
*М.В.: Людзі пяклі... гэто было гэдако жаланё ў нас. А другоё жаланё было за ноч зрэзаць паехаць у лес тры краста. Як стаялі ў вёсцы, пры Саветах як павыразалі, то за ноч зрабіць крастэ і паставіць. І выткаць: напрасьці, аснаваць і выткаць палаценцо, рушніке на кажны крэст...*
*І.: І гэта трэба было зрабіць уночы?*
*М.В.: За ноч. І за ноч зрабілі — вёска велькая, а што ж!*
*І.: Уся вёска рабіла?*
*М.В.: Уся вёска...*
*І.: І навошта гэта рабілася? Дзеля чаго?..*
*М.В.: Каб прагнаць немца. Каб Бог з намі быў»*[1].

Так людзі праводзілі таемны абрад, каб паскорыць канец вайны. Гэта адзін з прыкладаў, як вусныя ўспаміны могуць паказаць незвычайны погляд на беларускую гісторыю. Стаўленне простага чалавека, яго ўнікальны досвед, што раскрываюцца ў інтэрв'ю, дазваляюць пабачыць мінулае больш ярка і адначасова страката, сітуацыйныя аповяды дапамагаюць лепш разумець атмасферу таго часу. Мінулае сведкі гісторыі — непаўторны злепак падзей, абставін, памкненняў і асабістых якасцяў канкрэтнага чалавека. Апошні ўяўляе сабой вынік эпохі, у якую жыў і пра якую яму ёсць што распавесці, як правіла, з упорам на блізкія ўсім асноўныя вехі жыццёвай мадэлі (атрыманне адукацыі, уладкаванне кар'еры, стварэнне сям'і). Такі наратыўны дыскурс дапамагае лягчэй успрымаць нават складаныя пытанні, якія ўплятаюцца ў гістарычны кантэкст.

Вусная гісторыя недаацэньваецца беларускімі адукатарамі, бо з'яўляецца нетрадыцыйным падыходам у працэсе навучання. Чалавек «знізу» са сваёй рэакцыяй на тое, што адбывалася вакол яго, выкліканае рашэннямі «зверху», застаецца ў падручніках па-за кадрам. Таму гэты ракурс павінен быць асабліва цікавы тым, хто займаецца нефармальнай адукацыяй і шукае новыя перспектывы для зацікаўлення навучэнцаў, у тым ліку ў межах, здаецца, ужо даўно вядомых тэм.

Для выканання апошняй задачы адчувальна перавага такога тыпу крыніц, як успаміны, якія адлюстроўваюць не толькі розныя бакі жыцця беларускага грамадства, а і стратэгіі паводзін людзей, якія не былі звязаны напрамую са справаздачамі пасадных асобаў, а з унутраным светам чалавека, асаблівасцямі побыту яго сям'і. Інтэрв'ю са сведкамі часу могуць дапамагчы адукатару ў змаганні з міфамі ў гісторыі. Аднак выкарыстанне ўспамінаў патрабуе ўліку і мінусаў іх суб'ектыўнасці. Таму важна шукаць у іх не столькі факты, колькі сэнсы, якія ім надаваліся. Задача настаўніка асцярожна выкарыстоўваць гэтыя крыніцы, не прапускаючы магчымасці дапоўніць каштоўным матэрыялам існуючыя веды навучэнцаў, пашыраць кола тэм для разгляду, удасканальваць свае падыходы.

Калісьці маё зацікаўленне накірункам вуснай гісторыі прыйшло праз удзел у праекце канца 90-х «Гісторыя, якой няма ў падручніках», пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук Ніны Стужынскай. Тады збіраліся сведчанні рэпрэсаваных — якраз такія, што давалі інфармацыю цяжка даступную ў звычайных архівах, якія паказвалі гісторыю рэпрэсій праз прызму погляду іх ахвяраў. З часам у мяне сфармавалася больш пэўнае разуменне пра падыходы да збору інтэрв'ю, яго апрацоўку. Значным штуршком стаў нямецкі вопыт работы з ан-лайн архівамі ўспамінаў, які даў магчымасць пабачыць зручнасць арганізацыі працы з такімі крыніцамі ў іншых краінах.

1 Відэаінтэрв'ю Мураўскай Веры Аляксандраўны, 1930 г.н., в. Дуброва, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. // БАВГ. 1(1)–23–537, #1:36:03#.

→

Адсутнасць падобнага прадукту ў Беларусі наштурхнула на думку пра стварэнне архіва вуснай гісторыі ў нас. На матывацыю паўплывалі праблема скарачэння магчымасцяў зафіксаваць сведчанні рэспандэнтаў пра першую палову XX стагоддзя (цяпер мяжа праходзіць фактычна па польскім часе і пачатку другой сусветнай вайны), недаступнасць і знікненне ўжо створанага вуснагістарычнага матэрыялу, недахоп даследаванняў і праектаў з выкарыстаннем такога тыпу крыніц. Пасля перамоў са спецыялістамі ў галіне вуснай гісторыі, а таксама з праграмістамі, з красавіка 2011 года пачалася праца. Нашай мэтай стала стварэнне агульнай архіўнай платформы, якая б дапамагла вырашаць вышэйзгаданыя праблемы, дала доступ да корпуса вуснагістарычных крыніц зацікаўленым, без навязвання ім ацэнкі, для таго каб падштурхнуць да далейшага аналізу.

Са снежня таго ж года была арганізавана магчымасць доступу да такіх крыніц без рэдактарскіх правак у ан-лайн рэжыме. Інтэрнэт-праект «Беларускі архіў вуснай гісторыі» (БАВГ, www.nashapamiac.org) з'яўляецца архіўным сховішчам успамінаў сведак часу. Гэта арганізаваны на сучасных тэхналогіях партал, дзе ў аўдыё- і відэаформе прадстаўлены інтэрв'ю, сабраныя гісторыкамі, краязнаўцамі, грамадскімі дзеячамі ў межах экспедыцый і іншых даследчыцкіх праектаў.

Гэты навукова-адукацыйны рэсурс арыентаваны на забеспячэнне максімальнай даступнасці такога матэрыялу для зацікаўленых. Праект скіраваны на захаванне памяці ў першую чаргу пра савецкі (самы працяглы ў XX ст.) перыяд гісторыі Беларусі, у тым ліку па тэмах, якія з'яўляюцца актуальнымі і спрэчнымі, выклікаюць дыскусіі ў грамадстве. Калекцыйны падыход дае магчымасць выкарыстання ўспамінаў для распрацоўкі розных тэм і адукацыйных мерапрыемстваў, напісання артыкулаў.

Ставячы за мэту якаснае і колькаснае прадстаўленне вуснагістарычных крыніц, каманда архіва спадзяецца пасадзейнічаць пашырэнню кола пытанняў для разгляду ў будучых адукацыйных праектах і ўзбагачэнню іх дадатковай важнай інфармацыяй для разгляду. Выкарыстаны ў навучальных мэтах аналіз успамінаў людзей пра савецкі час будзе спрыяць узбагачэнню ведаў моладзі пра гісторыю рэгіёна. Мяркуем, узнікненне гэтай архіўнай платформы можа даць неабходны стымул узнікненню розных новых міждысцыплінарных праектаў, напрыклад, па праблемах памяці, ідэнтычнасці, у тым ліку і міжнародных, звязаных з беларускай тэматыкай.

Колькасць крыніц камплектавання архіва, якія ў тым ліку працягваюць стварацца, прадугледжвае яшчэ доўгі этап напаўнення БАВГ хаця б матэрыяламі ад уладальнікаў калекцый, якія выразілі згоду на іх размяшчэнне ў архіве. Пры павелічэнні колькасці даступнага матэрыялу, вырастае і значнасць архіва як інфарматыўнага рэсурсу для тых, хто займаецца гісторыяй Усходне-еўрапейскага рэгіёна, а таксама для адукацыйных, даследчых, выдавецкіх ініцыятыў іншых НДА і асобных актывістаў грамадзянскай супольнасці Беларусі.

Пры папулярызацыі важных для разумення мінулага звестак з успамінаў сярод школьнікаў магчыма павышэнне ўзроўню іх нацыянальнай самасвядомасці, узрастанне цікавасці да айчыннай гісторыі, узбагачэнне ведаў. Азнаямленне моладзі з падобным матэрыялам, яго глыбокае вывучэнне дапаможа аднаўленню страчаных культурных сувязяў, традыцый паміж пакаленнямі.

Адукатар можа здзяйсняць пошукі патрэбнага матэрыялу праз выбар і пераход да адпаведнай яго мэтам калекцыі і абранне канкрэтнага ўспаміну ці праз пошук на партале патрэбных сегментаў інтэрв'ю паводле геаграфічнага, тэматычнага, імяннога ці храналагічнага індэксаў (магчыма толькі для цалкам апрацаваных успамінаў). Пасля рэгістрацыі ён можа пачуць непасрэдна аўдыё- ці відэааповяд сведкі часу.

На дадзены момант для выкарыстання на партале размешчаны больш за 200 інтэрв'ю ў 17 калекцыях. У бліжэйшы час іх колькасць будзе павялічвацца, у тым ліку ў поўнай апрацоўцы, зручнасць карыстання ўдасканальвацца. Плануецца стварэнне інтэрактыўных геаграфічнай карты і храналагічнай лінейкі для адпаведнага пошуку ў межах успамінаў. Не абыдзены ўвагай тэматычныя накірункі. Зараз распрацоўваецца рубрыка, прысвечаная 1939 году ў гісторыі Беларусі, з наступнага года плануецца разгляд тэм «Голад у БССР», «Беларускія остарбайтэры», якія будуць ілюстраваны як урыўкамі з успамінаў, так і параўнальнымі навуковымі тэкстамі, традыцыйнымі архіўнымі дакументамі.

Шырыня ахопу перыяду архівам выклікана тым, што сведкі часу, як правіла, не канцэнтраваліся толькі на нейкіх вузкіх гістарычных праблемах, узгадваючы іх у кантэксце ўсяго жыццёвага вопыту. Таму мэтазгодна максімальна прадстаўляць паведамленую рэспандэнтам інфармацыю, што пашырыць магчымасці вывучэння розных перыядаў і пытанняў. Гэта звязана і з тым, што самі ўладальнікі калекцый успамінаў даследавалі розныя тэмы ў XX ст., як напрыклад, пра хіпі другой паловы 60-х.

Для правядзення адукацыйных праектаў БАВГ дае наступныя магчымасці:

1 Атрымаць веды па асновах правядзення вуснагістарычных даследаванняў;

2 Узбагаціць працэс навучання новымі ракурсамі, якія даюць вусныя ўспаміны;

3 Выкарыстаць ужо прадстаўленыя на партале матэрыялы без неабходнасці самастойнага збору падобных, што можа зберагчы час і матэрыяльныя выдаткі адукатара;

4 Афіцыйна спаслацца на крыніцы праз сапраўдны архіўны шыфр, указаны да кожнага матэрыялу ў БАВГ.

Захаванне гістарычнай памяці беларусаў актуальна. Яшчэ мала намаганняў прыкладаецца, каб зберагчы яе ў форме фіксацыі ўспамінаў людзей пра тыя ці іншыя гістарычныя перыяды. У той жа час, трэба старацца віртуальна вяртаць вартых памяці людзей з небыцця. У гэтым накірунку важныя намаганні як гісторыкаў, так і адукатараў. Праз выкарыстанне ўспамінаў можна навучыць моладзь разуменню гістарычнай памяці жыхароў Беларусі. І тут многае залежыць ад інтэрпрэтацыйных практык, якія выкарыстоўваюць адукатары. Шлях да сваёй сапраўднай ідэнтычнасці для беларусаў ляжыць праз захаванне памяці пра мінулае такой, якая яна ёсць, праз разуменне, што нават самыя невялікія магчымасці, якія ўзнікаюць у гісторыі, могуць мець вялікую каштоўнасць для будучых пакаленняў. ■